ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 94 (1363) | СУБОТА, 25-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАН'ТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.
Кошт асобнага №—2 кап.

Вынікі паводкі павінны быць ліквідаваны з максымальнай хуткасьцю

МЕНСК 25-га КРАСАВІКА

Тэлеграмы з месц прыносяць усё новыя весткі аб затапленьні паводкаю паселішч, аб новай пагрозе паводкі ў большасьці раёнаў Беларусі.

Зацяжная зіма з вялікімі сьнегавымі завеямі, рэзкае пацяпленьне ў апошнія дні, як і трэба было чакаць, выклікалі хуткае раставаньне сьнегу і вялікі разьліў рэчак. Гэты разьліў пагражае псаваньнем шляхоў зносін, нормальнай працы прамысловасьці.

Як агульнае зьявішча, прыходзіцца канстатаваць, што мясцовыя організацыі як сьлед не падрыхтаваліся, каб своечасова папярэдзіць стыхію і не дапусьціць страт. Наадварот, у зьвязку з наступіўшымі халадамі, за апошнія тыдні наглядаліся дэмобілізацыйныя настроі, што спрыяла непадрыхтаванасьці да сустрэчы паводкі.

Але гэта не апраўданьне для тых, хто бязьдзейнічае ў барацьбе з паводкай. Паводка якая стварае рэальную пагрозу нармальнай рабоце народнае гаспадаркі і нясе мільённыя страты, ня можа ня выклікаць законную трывогу ўсіх грамадзкіх організацый, ня можа не мобілізаваць увагу, энэргію ўсёй пролетарскай грамадзкасьці на ліквідацыю яе вынікаў. Прыклад самаадданай работы комсамолії, чырвонаармейцаў, і рабочых Эльводу і іншых прадпрыемстваў Менску па барацьбе з разводзьдзем заслугоўвае ўвагі. Ён павінен быць падвоены, патроены, падзесяцяроны, асабліва зараз пры ліквідацыі вынікаў паводкі.

Клясава-варожыя элемэнты сваімі енкамі, провакацыйнымі хлусьлівымі чуткамі сеюць паніку з тым, каб на шкодзіць мобілізацыі сіл на ліквідацыю вынікаў стыхійнага нясчасьця, скарыстоўваюць паводку для таго, каб паслабіць увагу працоўных у іх барацьбе за выкананьне плянаў 3-га, рашаючага году пяцігодкі. Гэтаму павінен быць нанесены руйнуючы ўдар.

Усе працоўныя Беларусі, усе мясцовыя організацыі, па вопыту Менску, павінны мобілізаваць сілы энэргію на ліквідацыю вынікаў паводкі.

Калі прабіла 4...

... Гарадзкая вежа прабіла 4 гадзіны раніцы. Працяжны тэлефонны званок:

— Стыхія бурыць серабранскі мост!

З надзвычайнай хуткасьцю загад абляцеў некалькі комсамольскіх колектываў. Зараз-жа прапанавалі гаражу падаць 3 грузавікі. І раней чым машыны прыехалі з Гаркому, 300 выкліканых комсамольцаў былі ў поўным зборы. Комсамольцы МШВ, якія знаходзяцца на адлегласьці 3 кілёмэтраў ад Гаркому, зьявіліся туды за 10 хвілін, замест 15 вызначаных. Грузавікі адышлі на месца трывогі. Комсамольцы высыпалі з машын і організавана, бяз шуму, захоўваючы цішыню, прыступілі да гарачай працы. Прорва ля маста была залатана. Комсамольскія рукі вырвалі з рук стыхіі мост...

Піонэрыя правяла вялікую работу. За дзьве гадзіны ўвесь горад апаясаны экстраным выпускам „Зьвязды".

Учора, 24-га

а першай гадзіне дню вада ўключана ў цэнтральны раён Менску. Падаецца 14000 вёдзер у гадзіну.

Для ліквідацыі вынікаў паводкі на Эльводзе організаваны брыгады, якія працуюць па розных галінах работы.

Увечары эльводаўцы змогуць пусьціць дызэль „Нобэль". Сёньня павінна быць пушчана нямецкая турбіна.

З корпусоў Эльводу працягваецца выкачка вады.

Комсамол у барацьбе са стыхіяй

Сьвіслач, гэтая недалужная рачулка, няшчадна сьціснутая абапал гмахамі, садамі, дамамі і брукам, асядланая размаітымі мастамі, узду мала паўтарыць свой велічны разьліў, падобны якому, як апавядаюць старажылы, здарыўся год сорак таму назад...

Штодня ўзровень вады ў рацэ ўзвышаўся, і 21 красавіка ўвечары Сьвіслач выйшла з берагоў.

Вада пацякла па садовай, Беларускай, Татарскай, Садова-Набярэжнай, Луліхавай Слабадзе, Клябанаўскім завулку і інш.

Вада наступала на электрастанцыю.

... Разьюшаная стыхія наступала мацней і мацней. А 9 гадзіне Сьвіслач прабілася ў машыннае аддзяленьне. Па шыі ў вадзе, рабочыя ўзьнімалі маторы, гэроічна змагаючыся са стыхіяй. А 2-й гадзіне, уноч на 22 красавіка, „Эльвод" спыніў работу. Спыніўся з-за непадачы току і рад прадпрыемстваў.

А 1-й гадзіне дня 22 красавіка ўзровень вады дасягнуў 380 сантым вышэй сярэдняга летняга ўзроўню.

А 1 гадз. 30 хв. узровень вады падняўся яшчэ на 3 сант.

Першую ноч паводкі комсамольская організацыя сустрэла непадрыхтаванай. Аднак, Менгарком 22 красавіка здолеў па-баявому пераключыцца на барацьбу з паводкай. Увечары было склікана пазачарговае пасяджэньне бюро Менгаркому а пасьля яго — зьлёт сакратароў комсамольскіх колектываў і ячэек, У тэрміновым парадку організаваны штаб па барацьбе з паводкай пад старшынствам заг. оргаддзелу т. Рудніцкага.

І ўжо падвячоркам комсамол Менску быў на-чаку. Пры кожнай ячэйцы і колектыве, у сваю чаргу, былі тэрмінова створаны штабы, якія трымалі бязупынную сувязь з штабам гаркому. У гэтую-ж ноч у раёнах паводкі былі організаваны комсамольскія пасты, наладжаны дзяжурствы, створаны ўдарныя комсамольскія брыгады, якія былі кінуты ў найбольш небясьпечныя раёны паводкі.

Уноч на 23 красавіка працавала 26 ударных комсамольскіх брыгад, каля 300 чал. Разам з гэтым, кожная ячэйка і колектыў тых прадпрыемстваў і ўстаноў, якім пагражала паводка, былі на перадавых позыцыях. Напрыклад, комсамольцы заводу „Комунар" працавалі і ўначы і ўдзень 23 красавіка. Сілы комсамольскага колектыву былі расстаўлены па ўсіх цэхах. Дзякуючы гэтаму, страты на заводзе зусім нязначныя ня гледзячы на вялікае затапленьне.

Комсамольцы-комунараўцы змаганьне са стыхіяй пераключылі на рэйкі соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Яны выклікалі на социялістычнае спаборніцтва па пытаньнях аховы заводу ад паводкі комсамольскі колектыў заводу імя Варашылава. Комсамольцы выкачвалі воду з цэхаў.

Комсамольцы і комуністыя заводу Варашылава паказалі прыклад бальшавіцкай работы ў змаганьні са стыхіяй Так, 70 комуністых і комсамольцаў удзень і ўвачы працавалі ля Аранскага маста мацуючы земляны вал.

76 комсамольцаў— на-чаку

Увесь комсамольскі колектыў заводу „Комунар", у колькасьці 260 чалавек мобілізаваны на барацьбу з паводкай. Тры зьмены ў дзень гэроічна абараняюць завод.

76 комсамольцаў на — чаку. Яны ахоўваюць маторы, рухавікі. Круглыя суткі 35 комсамольцаў рамантуюць мост (наладжваючы пераправу насельніцтва).

Машыны, маторы, рухавікі выратаваны. Аднак, усе цэхі заводу ў вадзе. Комсамольцы даюць прыклад змаганьня са стыхіяй. Агульны сход рабочых пастанавіў: дні прастою заводу адпрацаваць, каб ударнымі тэмпамі нагнаць прапушчанае.

Комсамольскія ячэйкі і колектывы г. Менску павінны пасьледаваць бальшавіцкай палкасьці „Комунараўцаў", змагацца з усімі перашкодамі на шляху пасьпяховага выкананьня прамфінпляну.

Дзяжурства на ўсю ноч

Пазаўчора на заводзе імя Варашылава былі створаны штаб па барацьбе з паводкай. Звыш 50 комсамольцаў мобілізаваны для замацаваньня маста і дастаўкі на месца работ каменьняў.

Усю ноч праводзіліся дзяжурствы ў якіх удзельнічала 30 комсамольцаў.

Сьлясарна-зборачны, кацельны, мэханічны і ліцейны цэхі не працуюць.

Ш.

* *
*

* Па-заўчора а 2 гадз. дня вада зьнізілася да 330 сант., а 6-й гадзіне рэчка пачала падаць і дайшла да 296 сант.

З вечару ды позьняе ночы цэнтр гораду быў асьветлены электрычнасьцю. Аднавіліся радыёперадачы.

* Вада бязупынна спадае. Уноч на 24 красавіка за 12 гадз. рацэ вада спала на 47 сантымэтраў.

* А 10 гадз. ўвечары—спад вады да 363 сант.

* МЦРК пераключыўся на дапамогу пацярпеўшым. За 22 крас. было выпечана 50 тон хлеба. Пацярпеўшым перададзены хлеб і гарачыя абеды ў трох пунктах. Увечары ўсе сталоўкі працавалі з поўнай нагрузкай. А 9 гадз. увечары быў пушчан на поўны ход хлебазавод.

* Для ратаваньня пацярпеўшых і перапраў іх прыдадзены 4 паромы.

ЮБІЛЕЙ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ" ПЕРАНЕСЕНЫ НА 10-га МАЯ

Скарыстаць застаўшыся час для яшчэ больш узмоцненай падрыхтоўкі да 10-гадовага юбілею

Пастанова

камісіі ЦК ЛКСМБ па правядзеньню 10-цігадовага юбілею „Чырвонай Зьмены"

1. У зьвязку з тым, што большая частка раёнаў з прычыны паводак да 25 красавіка г. г. ня можа быць абслужана справаздачнымі дакладамі рэдакцыі, што рэгулярны выхад газэты „Чырвоная Зьмена" часова спынены, сьвяткаваньне юбілею „Чырвонай Зьмены" з 25 красавіка перанесьці на 10 мая 1931 году.

2. Тэрмін, што застаўся да 10-га мая комсамольскія арганізацыі павінны скарыстаць на больш пасьпяховае і шырокае разгортваньне падрыхтоўчай работы да сьвяткаваньня юбілею, мобілізаваўшы ўвагу, актыўнасьць мас комсамольцаў, рабочай і працоўнай моладзі на выкананьне і перавыкананьне пляну першага паўгодзьдзя 3-га рашаючага году 5-цігодкі, на пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны, на 100 проц. ахоп комсамольцаў і моладзі ўдарніцтвам і спаборніцтвам, на ўзмацненьне работы па выкананьню ўхвал IX-га зьезду УсеЛКСМ аб перабудове работы комсамолу ў шматмільённую арганізацыю, выкананьня пастановы Бюро ЦК ЛКСМБ аб давядзеньні тыражу „Чырвонай Зьмены" да 60 тысяч.

3. Даручыць рэдакцыі „Чырвонай Зьмены" ўключыцца на старонках газэты гістарычныя шляхі і разьвіцьцё „ЧЗ" пасьля асьвятленьне ходу падрыхтоўкі ў арганізацыях да юбілею, а таксама да 10 мая падвесьці вынікі (праз газэту) усіх мерапрыемстваў, высунутых з зьвязку з 10-цігадовым юбілеем „Чырвонай Зьмены".

4. Прызначанае на 25 красавіка ўрачыстае пасяджэньне ЦБ, Менгаркому ЛКСМБ і рэдакцыі „Чырвонай Зьмены", з удзелам КСМ актыву г. Менску, у зьвязку з 10-цігадовым юбілеем „Чырвонай Зьмены"—перанесьці на 10 мая.

У краінах капіталу

Напярэдадні 1-га Мая

РУМЫНСКІЯ СОЦЫЯЛ-ФАШЫСТЫЯ „СУПАКОЙВАЮЦЬ" РАБОЧЫХ

ВЕНА, 18. Як паведамляюць з Бухарэсту, 15 красавіка ў даліне Жыля (вугальны раён у Румыніі) зволена 1530 гарнякоў. Адначасова прадпрыемцы зьнізілі заработную плату астатнім рабочым на 5-13 процантаў. Зволеныя гарнякі бязьлітасна выкінуты з свайго жыльля ў пасёлках, якія належаць прадпрыемцам. Соц. фашысцкія профбюрократы, як і заўсёды, прымаюць усе меры, каб перашкодзіць барацьбе ўзбураных рабочых. Орган румынскага буйнага капіталу „Дымінаца" са злавальненьнем піша: „Профсаюзы праводзяць шматлікія сходы і прыкладаюць нячуваныя намаганьні, каб супакоіць усхваляваных рабочых".

Супроць фашысцкага наступу

ВЕНА, 19. Орган аўстрыйскай компартыі „Ротэ Фанэ" публікуе першамайскую адозву аўстрыйскай компартыі і рэволюцыйнай профопозыцыі. У адозьве адзначаецца, што 1 мая павінна быць днём барацьбы, днём масавых выступленьняў супроць рабаўніцтва заработнай платы, супроць крайняга зьніжэньня дапамогі беспрацоўным, супроць зьнішчэньня соцыяльнага страхаваньня, за пашырэньне сопыяльнага страхаваньня, за павышэньне заработнай платы і за ўстанаўленьне 7-гадзіннага працоўнага дня пры поўнай заработнай плаце.

Асноўныя лёзунгі 1-га Мая—„Супроць фашысцкага ўраду", „За рабоча-сялянскі ўрад", „На абарону Савецкага Саюзу", „За савецкую Аўстрыю і яе далучэньне да савецкай Нямеччыны", "На барацьбу за працу, хлеб і волю".

Рабочая моладзь стварае першамайскія камітэты

БЭРЛІН, 16. У сувязі з набліжэньнем 1 мая, цэнтральны камітэт нямецкага комсамолу зьвярнуўся да працоўнай моладзі гораду і вёскі з адозвай, у якой адзначае, што 1 Мая павінна прайсьці пад знакам барацьбы за істотныя патрабаваньні працоўнае моладзі і супроць дыктатарскіх дэкрэтаў ураду Брунінга. Цэнтральны камітэт заклікае моладзь на прадпрыемствах, ва ўстановах і на біржах працы стварацы рэволюцыйныя камітэты па правядзеньні 1 Мая.

МАТРОСКІЯ БУНТЫ Ў ГІШПАНІІ

ЛЁНДАН, 23. Па паведамленьню з Кадыкса (Гішпанія), на трох ваенных суднах выбухла паўстаньне. Удзельнікі паўстаньня пасаджаны ў турму. Вялікае нездавальненьне назіраецца сярод матросаў і ў іншых морскіх базах Гішпаніі. Многія маракі спачуваюць комуністым і заяўляюць, што новы рэжым мала адрозьніваецца ад старога. Маракі протэстуюць супроць таго, што ў іх становішча ня ўнесена да гэтага часу ніякага палепшаньня.

Расстрэл рабочых у Нямеччыне

БЭРЛІН, 20. Учора ў Гамме (Вэстфалія) комуністычнай партыяй была наладжана дэмонстрацыя ў памяць 300 рабочых, якія загінулі ў час каппаўскага путчу.

Адбыліся крывавыя сутычкі паміж дэмонстрантамі і поліцыяй, прычым былі забіты 3 рабочых і цяжка паранены 4. Калі 5-тысячная маса дэмонстрантаў рушылася да могілак у Пэлькуме, дзе знаходзяяцца брацкія могілкі загінуўшых у рэволюцыйнай барацьбе рабочых, поліцыя, якая забараніла дэмонстрантам доступ да брацкіх могілак, адкрыла па рабочых агонь. У адказ на гэту нячуваную провокацыю, узбураныя да крайнасьці рабочыя паранілі некалькі поліцэйскіх.

Рабочыя дэлегацыі ў СССР к 1-му Мая

ЛЁНДАН, 23. Рабочая дэлегацыя ў складзе 7 чалавек, абраная на фабрыках і заводах у розных частках краіны, выехала на савецкім параходзе „Коопэрацыя" з Лёндану ў СССР для ўдзелу ў сьвяткаваньні 1-га Мая. Сумесна з дэлегатамі едуць яшчэ 16 чалавек; паездку організуе таварыства прыхільнікаў Савецкага Саюзу.

ВЕНА, 23. Учора на прадпрыемствах скончыліся выбары першамайскай дэлегацыі рабочых у СССР. Абрана 11 соцыял-дэмократычных рабочых, 3 комуністыя і 2 беспартыйных. Соц. дэмократычныя дэлегаты, сярод якіх 4 члены фабзаўкому і 5 профсаюзных упаўнаважаных, заявілі, што яны не зважаюць на загад соц.-дэмократычнага цэнтральнага камітэту, які забараньне ім паездку ў СССР.

Напярэдадні другой гадавіны соцспаборніцтва.

Трымаць раўненьне па перадавых

Беларуская гарбарная прамысловасьць выканала пяцігадовы плян у 2½ гады.

Новымі ўдарнымі брыгадамі штурмаваць прарывы, змагацца за 518 і 1040.

Гарбарная прамысловасьць БССР выканала пяцігодку ў два з паловай гады

Па пляну, да канца пяцігодкі гарбарная прамысловасьць БССР павінна была выпускаць штодзённа 1185 буйных скур, зараз яна ўжо выпускае 1550, і замест 5267 дробных скур—выпускае 5151 штуку. Абутку штодзённа выпускаецца 8796 пар, замест прадугледжаных па пляну 8069 пар.

Валавая прадукцыя ў канцы пяцігодкі павінна была выражацца ў суме 49600000 руб, праграма-ж 1931 г. прадугледжвае выпуск прадукцыі на 54411000 р.

Капітальныя затраты на ўсю пяцігодку былі намечаны ў 10458000 рублёў. Зараз, выканаўшы асноўныя намёткі пяцігодкі, затрачана на капітальнае будаўніцтва гарбарнай прамысловасьці 7103000 р.

У сваім рапарце ЦБ КП(б)Б—ЦВК БССР, ЦСПСБ і ВСНГБ, Бел скурабʼяднаньне і ЦІ саюзу гарбароў заяўляюць, што ўсе гэтыя дасягненьні магчымы былі толькі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву нашай партыі ў яе рашучай барацьбе з усімі ўхіламі ад генэральнай лініі.

Рапартуючы аб сваіх дасягненьнях, рабочыя гарбарнай прамысловасьці БССР заяўляюць, што яны ў далейшым пойдуць па шляху, [пака]заным Леніным і з яшчэ большай упартасьцю будуць змагацца за канчатковую пабудову сацыялізму.

Неабходна тэрміновыя захады

Прамфінплян фабрыкі „Звзувi“ выконваецца на больш, як на 60 проц. Вуакім месцам зьяўляецца скрыначны цэх.

Няма скрынак, а ў выніку—штодзённыя прастоі здымальных і этыкетовачных варштатаў. Тысячы рублёў страты. На матэр'ялах лёгкай кавалеры, стругальны цэх дастаўляе дрэнную шчэпу, адсюль—конвэерны прастой варштатаў.

Рацыяналізацыя амаль не праводзіцца. Рабочкнiга здымальнага аддзяленьня прымушаны бегаць за скрынкамі з другога паверху на першы.

Два год фабрыка знаходзіцца на чорнай дошцы. Неабходны тэрміновыя захады да ліквідацыі прарыву.

Пост „Ч.З“ Даўгапольская, Быхаўская, Соркіна, Маеўская.

Змагацца за якасьць

Плян выпуску экспортнай фанеры Бабруйскі дрэваапрацоўчы комбінат за ўдарны квартал выканаў усяго на 30 проц.

Недабраякасная ісжтужка фанеры, няправільная клейка яе, рэзка калод неадпаведна разьмеру фанеры і, нарэшце, тое, што сушыльныя прэсы недавыкарыстоўваюць свае нормы пары—вось прычыны невыкананьня пляну.

Усё гэта вывучыла плянава-опэрацыйная група, па ініцыятыве якой зараз абвешчан дэкаднік паходу за якасьць прадукцыі.

Паміж брыгадамі і моладзьдзю складзены ўмовы на соцспаборніцтва за лепшы выпуск колькасьці і якаснай фанеры. Рыхтуюць выпуск спэцыяльнай насьценгазэты.

Дэкада паходу за якасьць дапаможа ліквідаваць прарыў у выкананьні прамфінпляну.

Ф. Хазанаў.

Перазаключаем дагаворы

У зьвязку з набліжэньнем другой гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва, зараз па ўсіх гомельскіх школах ФЗС праводзіцца падагульненьне вынікаў соц. спаборніцтва і перазаключэньне соцумоў.

М. Сохань.

Пачаўся дзесяцідзёньнік ФЗВ

за ўдарныя цэхі вучобы, за замацаваньне заваяваных позыцый ФЗВ

З 20-IV г. г. пачаўся 10-ці дзёньнік ФЗВ, абвешчаны ВСНГ СССР. У часе 10-ці дзеньніка комсамольская організацыя павінна мобілізаваць усю грамадзкасьць, разгарнуць працу па замацаваньню дасягненьняў і яшчэ большаму разгортваньню сеткі школ ФЗВ

У 1928-29 гаспадарчым годзе рэспубліканская прамысловасьць БССР мела тры школы ФЗВ, у якіх навучалася 2-0 чал.; у 1930 г.—15 школ ФЗВ з 1456 вучнямі, 1-1—31 г.—18 школ ФЗВ з 3454 вучнямі і на 1-IV г. г.—26 школ ФЗВ, у якіх навучаецца 6195 вучняў. Гэтыя лічбы зьяўляюцца сьведкамі гіганцкага росту школ ФЗВ па беларускай прамысловасьці.

Аднак гэты рост не дае яшчэ поўнага выкананьня пастановы партыі аб тым, што да канца пяцігодкі школы ФЗВ пав іны забясьпечыць усю прамысловасьць БССР кваліфікаванымі кадрам на 60 проц.

Зараз яшч э ў наяўнасьці значны разрыў між колькасным ростам школ ФЗВ, ахопам вучняў і забясьпечаньнем школ памяшканьнем, абсталяваньнем і г. далей.

Каб палепшыць працу школ ФЗВ, прэзыдыум ВСНГБ адпусьціў на іх капітальнае будаўніцтва 1577100 руб. і ўвайшоў з хадайніцтвам у СНК БССР аб асыгнаваньні дадатковых сродкаў у суме 1791240 р. Без належнай увагі і ўдзелу гаспадарчых, партыйных, комсамольскіх і профсаюзных організацый ФЗВ, нават і пры наяўнасьці гэтых сродкаў, ня здолее належным чынам выканаць ускладзеныя на яго аб'вязкі па падрыхтоўцы кадраў соцыялістычнай прамысловасьці.

У адзнаку 10годзьдзя школы ФЗВ прэзыдыум ВСНГБ ухваліў вылучыць спэцыяльны фонд для прэміяваньня лепшых школ і вучняў; зам цаваць пэ[ў]ную колькасьць новага абсталяван[ьня] за школамі ФЗВ з .л ку т[…] якія прыбудуць на працягу 1931 го[да]; капітальнае будаўніцтва школ Ф[ЗВ] лічыць ударным і пазачарговым.

Заводакіраўніцтвам запрапанава[на] прымаць больш ўдзел і аказв[аць] практычную дапамогу ў працы ш[кол] ФЗВ. Разам з фабзаўкомамі парт[ыйныя] і комсамольскімі ячэйкамі распрацава[ць] пытаньне аб пашырэньні школ Ф[ЗВ].

На дырэктароў заводаў, фабр[ык], пры якіх з находзяцца школы Ф[ЗВ], ускладзена адказнасьць за якас[ьць] тэорэтычнага і практычнага навуча[нь]ня ў школах.

Гэтая пастанова абавязвае ўсіх г[ас]падарнікаў сапраўды павярнуцца т[ва]рам да ФЗВ, прызнаць школу Ф[ЗВ] цэхам прадпрыемства не формальн[а], а аказваць штодзённую дапамогу і [кі]раўніцтва ў працы,

Комсамольская організацыя паві[нна] ўзяць на сябе рад конкрэтных абав[язь]каў з тым, каб палепшыць працу ф[аб]завучу. Вытворчыя комсамольскія [ко]лектывы, пры якіх знаходзіцца шк[олы] ФЗВ, павінны сачыць за забясь[пе]чаньнем ФЗВ тэх'абсталяваньнем, структарамі па вытворчаму навуча[нь]ню з ліку лепшых комсамольцаў.

Будаўнічыя комсамольскія ячэ[йкі] павінны ўзяць шэфства над об'ект[амі] б. даўніцтва ФЗВ.

Сэктар прамкадраў і мэтадком Н[ар]комасьветы пав нны палепшыць мэ[то]дычнае кіраўніцтва, сваячасова забя[с]печваць школы навучальнымі пляна[мі], пэрыодычна правяраючы на мясцох [як] гэтыя пляны выконваюцца.

Белдзяржвыдавецтву неабходна [ўзя]яцца выданьнем сэрыі падручнік[аў], у якіх зараз адчуваецца значны не[да]хоп, перавесьці на беларускую мо[ву] тэхнічную літаратуру, якая патрэб[на] для ФЗВ.

Выканаьне ўсіх гэтых запатраб[а]ваньняў, якія забясьпечаць палепша[нь]не працы ФЗВ, зьявіцца ле шым [па]дарункам юбіляру і ўсяе нашае п[ра]мысловасьці.

Р. Бэдынэрм-н.

Месячнік баявой вясеньняй трывогі комсамолу

Колгасы Палесься пачалі сяўбу

УДАРНАЯ БРЫГАДА, ЛІКВІДАЦЫЯ АБЯЗЬЛІЧКІ І ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА, АЦЭНЕНАЯ Ў ПРАЦАДНЁХ, ВЫРАШАЦЬ ПОСЬПЕХ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ

Колгасы Лельчыцкага раёну пачалі сяўбу

Лельчыцы, 23. (Па тэлеграфу)—У раёне пачалася сяўба. Колгасы організавана і дружна выходзяць у поле.

Колгас „3-ці Інтэрнацыянал“ узараў і засеяў 13 га. Колгас „Чырвоны араты“ сёньня поўнасьцю вышаў у поле для воркі.

Уся вёска Асінская, за выключэньнем некаторых гаспадарак, у сувязі з выхадам колгасьнікаў у поле улілася ў колгас.

Організаваны нядауна Райкамолам колгас „КІМ“ зьяўляецца найлепшым у раёне па сваёй падрыхтаванасьці да сяўбы. Колгас таксама выйшаў ў поле.

Сідарук.

Ня зьніжаць ўзятых тэмпаў

Месячнік баявой вясеньняй трывогі комсамолу ўзьняў новую хвалю энтузіязму комсамольцаў і моладзі колгасу „1-га мая“ (Горацкі раён). Узяты звышударныя тэмпы ў падрыхтоўцы да сяўбы. Ссыпаны і ачышчаны патрэбныя насенныя фонды, утвораны кармовыя фонды.

Рабочая сіла разьмеркавана па паасобных галінах работы. Складваюцца ўдарныя брыгады на час вясеньняга севу.

Колгас склаў нормы выпрацоўкі, якія ўжо зацьверджаны на агульным сходзе колгасьнікаў. Уся праца колгасу пераводзіцца на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх.

Колгасьніцы абвясьцілі сябе ўдарніцамі другой бальшавіцкай.

Уся падрыхтоўка да вясны цесна ўвязваецца з масавай работай па барацьбе за новы колгасны прыліў.

Пуд.

Дамо продукцыйнасьць

Грэск, 22. (Па тэлефону ад нашага юнкора). Комсамольская ячэйка колгасу „Чырвоны Маяк“ організавала шырокую масавую работу па перав. колгасу на зьдзельшчыну. Комсамольцы організавалі пагэтаму пытаньню прапрацоўку рашэньняў 6-га зьезду саветаў сярод колгасьнікаў.

22 красавіка адбыўся агульны сход колгасьнікаў, на якім абгаворана пытаньне аб пераходзе на зьдзельшчыну. Агульны сход ухваліў перавесьці ўсю працу на зьдзельшчыну, з лікам у працаднёх. Пасьля схаду адбылася вытворчая нарада, якая зацьвердзіла нормы выпрацоўкі.

Комсамольская ячэйка колгасу „Чырвоны Маяк“ выклікала на спаборніцтва Грэскую ячэйку па пытаньнях пераводу колгасаў на зьдзельшчыну і ўзьняцьця продукцыйнасьці працы. **Ц. Макарэнка.**

Ударнік другой бальшавіцкай

Комсамольцы і беспартыйная моладзь колгасу „Рой“ (Барысаўскі раён) абвясьцілі сябе ўдарнікамі другой бальшавіцкай. Ячэйка організавала з комсамольцаў і моладзі ўдарныя брыгады для выкананьня асобных работ да другой бальшавіцкай вясны.

Сіламі комсамольскіх брыгад у колгасе адрамантавана 26 плугоў, 36 хамутоў і інш. сельска-гаспадарчы інвэнтар. Пратручана 290 цэнтн. аўса, 15 ячменю, 8 ільнанасеньня і 8 пшаніцы.

Партыйна-комсамольская ячэйка па-ударнаму організавала работу па пераводу колгасу на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх. Уся праца колгасу пераведзена на зьдзельшчыну і выпрацаваны нормы вырабаткі.

Як вынік ударнай работы партыйнай і комсамольскай ячэек і колгасу ў падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы, пачаўся новы прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. За апошнюю дэкаду падрыхтоўкі да сяўбы ў колгас уступіла 9 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Голь.

У абозе.

Плешчаніцы. (Па тэлефону). У раёне 72 колгасы, а толькі 8 перашлі на зьдзельчшыну з улікам у працаднёх. Астатнія колгасы, дзякуючы дрэннаму кіраўніцтву райкалгассаюзу, не пераводзяць работу колгасу на зьдзельшчыну. **А. З.**

Як паступіць у вайсковыя школы

Жадаючыя паступіць у вайсковыя школы павінны выбраць такі рад аружжа, які іх больш цікавіць і куды магчыма паступаць па стану здароўя, адукацыі і інш якасьцям.

У якія школы магчыма паступаць?

1. Сухапутна-страявыя вайсковыя школы:

г. Менск—Аб'яднаная Беларуская школа з адзяленьнямі пяхоты і артылерыі.

г. Ленінград—Барысаглебская кавалерыйская школа: школа сувьзі і арттэхнічная.

2. Авіяцыйныя вайсковыя школы:

г. Масква— Школа спэцыяльнай службы.

г. Ленінград—Тэорытычная школа: курс тэхнічнай падрыхтоўкі.

3. Вайскова-морскія школы:

г. Ленінград—Вайскова-морская школа імя Фрунзэ з адзяленьнямі: берагавой абароны, падрыхтоўчы курс і першы спэцыяльны; Інжыьэрная школа імя Дзержынскага з адзяленьнямі: мэханічным і суднабудаўнічым.

4. Школы грамадзянскай авіяцыі:

г. Масква—Першы авіятэхнікум.

г. Тамбоў—Другая аб'яднаная школа з аддзяленьнямі: пілотаў і тэхнікаў

Якія ўмовы для паступленьня ў школы?

У страявыя сухапутныя школы: ня менш 70 проц. рабочых, ня менш 80 проц. членаў ЛКСМ і КП(б)Б, а ў спэцыяльныя: 100 проц. членаў ЛКСМ і КП(б)Б Узрост: на аддзяленьне пяхоты, артылерыі, сувязі і кавалерыі—з 18 да 22 год, у спэцыяльныя—з 18 да 25 год. Па адукацыі: на аддзяленьні пяхоты, кавалерыі—4-х 5-ці годка, у астатнія-7-мі, 9-ці гадка.

У авіяцыйныя вайсковыя школы: ня менш 80 проц. рабочых з 2-х гадовым вытворчым стажам, 100 проц. членаў ЛКСМ і КП(б)Б; узрост—з 18 па 25 г. па адукацыі—5-ці годка.

У ваенморшколы: рабочых і дзяцей рабочых 85 проц., членаў ЛКСМ і КПБ 80 проц.; узрост—з 17 да 21 г.; па адукацыі ў школу імя Фрунзэ—7-мі годка, імя Дзяржынскага—9-ці годка.

Школы грамадзянскай авіяцыі: ня менш 70 проц. рабочых, членаў ЛКСМ і КП(б) 60 проц.; узрост—з 18 да 25 г.; адукацыя—5-ці годка, а ў Маскоўскі тэхнікум—7-мі годка.

Якія патрэбны дакуманты?

Даведка аб нараджэньні, аб соцыяльным паходжаньні і становішчы, аб адукацыі, аб нясудзімасьці, аб здар[оўі] і рэкомэндацыі гаркому і райко[му] ЛКСМ (у морскія школы—2 фо[та]карткі),

Парадак падачы заяў і адбор паст[у]паючых у школы:

Страявыя школы

Жадаючы падае заяву з вышэйадзн[а]чанымі дакумантамі ў камісію, як[ая] існуе пры РВК, гарсаветах і буйн[ых] прадпрыемствах, саўгасах і колгас[ах] (у гэтыя камісіі ўваходзіць прадста[ў]нік РК, колектыву ЛКСМ). Камі[сіі] правяраюць правільнасьць дакуманта[ў], робяць мэд. агляд і іспыты па аду[ка]цыі. На ўсіх тых, хто акажацца г[од]ным дакуманты пасылаюцца ў школ[ы]. Школы пэрсанальна праз камісіі [і] друк паведамляюць аб тэрмінах [іс]п[ы]таў. Орыентовачна прыём намеча[ны] з 15 верасьня па 1-е кастрычніка, а адбор кандыдатаў павінен быць зако[н]чаны ў красавіку месяцы.

Авіяцыйныя вайсковыя школы

Заява з дакумантамі падаецца ў ра[й]камісію, якая існуе пры РК ЛКС[М]. Камісія правярае правільнасьць дак[у]мантаў, праводзіць мэдагляд і іспыт[ы] пз адукацыі. На ўсіх тых, хто ак[а]жацца годным, дакуманты камі[сія] прадстаўляе на бюро РК, акое ка[н]чакова іх разглядае і камандыруе [у] школы.

Гаркомы і райкомы накіроўваю[ць] дакуманты на ўсіх камандыраваных [у] вайсковы аддзел ЦК ЛКСМБ, які ка[н]чаткова іх разглядае і накіроўвае [у] школы, а кандыдатам высылае п[раз] РК пасьведчаньні, па якіх камандыр[а]ваныя атрымоўваюць у Ваенкамат[ах] праязныя літэры ў школы. Орыент[о]вачна іспыты намечаны з 1-га па 20 чэрвеня, але адбор кандыдатаў і пр[а]сылка матар'ялаў вайсковы аддз[ел] ЦК павінны быць скончаны да 20 кр[а]савіка.

У вайскова-морскія школы і школ[ы] грамадзянскай авіяцыі парадак такі-[ж] самы як і ў авіяцыйныя, за выклю[]чэньнем таго, што ў камісію па адбо[]ру ў школы грамадзянскай авіяцы[і] ўключаецца прадстаўнік профсаюзу.

У Тамбоўскую аб'яднаную школ[у] першы тэрмін: да 15-V і 2-гі тэрмін-да 1-XI. Іспыты орыентовачна намеча[]ны: першы тэрмін: 15-VI, 2-гі тэр[]мін—1-XII.

У Маскоўскі авіятэхнікум адбор на[]мечаны да 15-X, іспыты—1-га ліста[]пада.

Гузікаў.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ. Галоўлітбел 599 Друкарня імя тав. СТАЛІНА.